# У агні з усіх бакоў...

ПАВЕЛ ВАЙНІЦКІ

**— Што я нарабіў!!! Навошта я гэта зрабіў?!!! Ну навошта? Гэтай рэакцыі вядомага беларускага мастака на свой апублікаваны тэкст я ніяк не чакаў. Няўжо пара крытычных заўваг маюць *такі* эфект? Мяркуючы па быццам бы шчыраму бедаванню аўтара — можа, надалей варта быць крыху мякчэйшым у характарыстыках? Ва ўсялякім выпадку, здаецца, ён сур'ёзна ўзрушаны, шкадуе і відавочна гатовы выправіцца... Значыць, усё не дарэмна?**
**Але тут прагучаў фінальны акорд:**
**— Навошта я аддаў у часопіс фота сваіх твораў для твайго артыкула?!?**

Усе мы ведаем, што азначае слова «крытыка». Чаму ж яно павінна значыць нешта іншае з прыстаўкай «арт»? Так, арт-крытыка — гэта перш за ўсё крытычнае меркаванне. Прафесійнае, публічнае і традыцыйна ацэначнае. З нагоды мастакоў, іх работ і мастацкага працэсу ўвогуле...

Але не ўсё, што кімсьці і дзесьці пішацца пра мастацтва, — арт-крытыка апрыёры. Арт-журналістыка — у адрозненне ад арт-крытыкі — не патрабуе ні спецыялізаванага ведання філасофскіх і гістарычных асноў мастацтва, ні знаёмства з яго найноўшымі тэндэнцыямі. Задача арт-журналістыкі — хроніка «найбольш цікавых» арт-падзей і з'яў у неспецыялізаваных выданнях, арыентаваная на непадрыхтаванага ў пытаннях сучаснага мастацтва чытача. Паміж арт-крытыкай і мастацтвазнаўствам таксама палягае амаль непераадольная расколіна, на адным баку якой — надзённасць, эмацыйнасць і нават літаратурнасць крытыкі, на другім — акадэмічнасць мастацтвазнаўчага даследавання.

І самае галоўнае: арт-менеджмент, арт-бізнес і арт-крытыка — абсалютна розныя рэчы. У той час калі крытычны разбор можа ўтрымліваць негатыўныя, але аб'ектыўныя (ці прынамсі шчырыя) ацэнкі, салодкі кактэйль з кампліментаў і цытат модных аўтараў, прысвечаны «выдатным творам і іх выдатным творцам», — гэта папросту хвалілка, прызначаная для прасоўвання твора/творцы на рынак. Накшталт рэкламы, дзе яны выступаюць у якасці спецыфічнага тавару. Каб яго прадаць, зусім няважна, да чаго апеляваць — да летуценнага дзяцінства мастака ці соцыякультурных канцэптаў Бурдзьё. Да арт-крытыкі такі спосаб калямастацкага пісьма не мае ніякага дачынення.

Тым не менш нават ад айчынных калег даводзіцца чуць пра сучаснага крытыка, які «ідзе на рынак і займаецца маркетынгам і піярам». Цікава, што гэтая стратэгія падаецца ў якасці прагрэсіўнай — менавіта яе мы абавязкова павінны запазычыць з Захаду разам з рынкам мастацтва, якога ў нас (ці на жаль?) пакуль няма. Не менш цікава, што інтэрнацыянальна прызнаныя аўтарытэты арт-крытыкі з непакоем кажуць пра крызіс галіны, у якой яны з'яўляюцца вядучымі прафесіяналамі. А таксама пра «прыроджаную кабалу калекцыянераў, дылераў і аўкцыёных "табеляў аб рангах"», па вызначэнні Майкла Дункана, у якой сёння аказваецца крытык. І пра паступовую страту ўплыву на арт-працэсы, бо якасць мастацтва, якую крытыка павінна адстойваць, ужо нікога не цікавіць: вырашальным фактарам у поспеху мастака выступае агрэсіўная піяр-кампанія. Як заяўляе Элеанор Хартні, «у арт-крытыкі сур'ёзныя праблемы. Сёння яна ў агні з усіх бакоў...» Сярод крыніц узгарання — поп-культура, пад яе ціскам сам фармат крытычных артыкулаў становіцца ўсё больш спрошчаным, гламурным. У якасці дроў — капіталізацыя мастацтва, што неўтаймоўна расце. Рынак забівае крытыку, бо не мае ў ёй патрэбы — камерцыйная мадэль пісьма паступова апрапрыіруе крытычную. Арт-крытыка ўсё больш становіцца падобнай на рэкламу і на забаўляльную журналістыку. Здаецца, што «на Захадзе» масты да адступлення на тэрыторыю чыстага крытычнага меркавання ўжо спалены...

На гэтым фоне сітуацыя з арт-крытыкай «у цэнтры Еўропы» выглядае бясхмарнай. Пры адсутнасці арт-рынку крытыкі робяць сваю справу, кіруючыся перакананнямі пераважна прынцыповага кшталту. «Не магу (варыянт: не хачу) маўчаць» — вось галоўная інтэнцыя стварэння тэкстаў. Але ў агульнай масе адсутнасць агню выглядае трывожным сімптомам. Апісальнасць і «ўхваляльнасць» публікацый у айчынных часопісах можна разглядаць як інерцыйныя наступствы метадаў савецкай крытыкі, дзе крытычны інструментарый быў выдалены. Праз непатрэбнасць — бо «сацыяльная карысць работы важнейшая за яе мастацкія вартасці» — менавіта з гэтай, вызначанай Троцкім, пазіцыі ацэньваліся савецкія творы. Ідэалагічны прэсінг знік, а новыя крытычныя падыходы так і не сфармаваліся, вынікам чаго сталася наяўная нядольнасць (ці паліткарэктна — абмежаваная здольнасць) беларускай крытыкі рабіць крытычныя меркаванні.

Аднак сцвярджаць, што беларускай крытыкі няма (а мне даводзілася быць сведкам падобных высноў), — па меншай меры дзіўна. Ёсць інстытуцыі, якія даюць адпаведную прафесійную адукацыю. Не, ні ў каго ў дыпломе пакуль не напісана «арт-крытык», бо акадэмічная ступень у гэтай сферы параўнальна нядаўна з'явілася і ў заходніх універсітэтах. Людзі прыходзяць з розных галін: толькі атрымаўшы пэўны аб'ём спецыфічных ведаў аб мастацтве, можна рабіць ацэначныя меркаванні. І гэтыя веды даступныя. У нас адбываецца паступовае асэнсаванне арт-працэсу, крытычная маса назапашваецца ў рэцэнзіях, аглядных і праблемных артыкулах. Такім чынам працуюць пэўныя мадэлі ўзаемадзеяння паміж крытыкуючымі і аб'ектамі крытыкі (пра іх эфектыўнасць паразважаем крыху далей). І нарэшце — агенты інстытута арт-крытыкі, нешматлікія (але і не забітыя «крыху больш, чым на дзве трэці», як іх заходнія аналагі, рэкламай гадзіннікаў, алкаголю, парфумы) мастацкія выданні. А таксама шэраг інтэрнэт-сайтаў, дзе ствараецца жывое асяроддзе для прыватных каментарыяў. То-бок ёсць інфраструктура, што жыве паводле ўсталяваных правілаў і мадэлей — дзіўных, непадобных на заходнія, але гэта не падстава адмаўляць ёй у існаванні.

Падаецца, што ў нашай сітуацыі ўсё не так безнадзейна. Больш за тое — у нас ёсць унікальны шанец: без ідэалагічных і камерцыйных інтарэсаў (якія амаль адсутнічаюць) стварыць менавіта ў арт-крытыцы нешта нікім не ангажаванае і арыгінальнае.



**Вольга Сазыкіна.**
**Адна вельмі старая гісторыя.**
**Ручная папера, трава.1999.**

Репозиторий БНТУ



**Сяргей Шабохін. Noch Einmal. Руска-нямецкі слоўнік (з нататкамі перакладчыка), два вентылятары. 2010.**

А зараз вернемся да траўматычных перажыванняў мастака з нагоды аддадзеных ілюстрацый. Акрамя гэтага выпадку, я добра памятаю тыя са сваіх постпублікацыйных стасункаў, якія сталі пачаткам прадуктыўнай дыскусіі з апанентамі. Тым не менш згаданая напачатку рэакцыя з'яўляецца характэрнай. Працуеш у фармаце крытыкі? Ты — асабісты вораг у вачах мастака, якога асмеліўся закрануць. Верагодна, аўтар лічыць, што яго працы стануць лепшымі, калі крытык замоўкне.

«Актуальныя» аўтары таксама чакаюць пазітыўных водгукаў — з'яўлення «арт-крытыка, які быў бы за нас» — па словах аднаго з рэпрэзентантаў галерэі «Ў» і — чыста выпадкова — прадстаўніка наступнай генерацыі мастакоўскай дынастыі, вышэйзгаданы патрыярх якой расхваляваўся з нагоды аддадзеных фотак. Але чым гэта будзе адрознівацца ад звычайнага і, на жаль, занадта часта практыкаванага кампліментарнага падыходу? Ад звычайнай публікацыі ў гэтым часопісе?

Дадзеныя рэакцыі і спадзяванні — архаічныя. У эпоху глабальнага камунікацыйнага выбуху галоўнае — проста быць, прысутнічаць у інфармацыйнай прасторы, неістотна — з пазітыўным ці негатыўным знакам. Нават у камерцыйным сэнсе: незалежна ад таго, што будзе сказана ў рэвю, само яго з'яўленне ўсё роўна падтрымлівае рэйтынг мастака. У адрозненне ад большасці заходніх калег, тыповым прадстаўнікам нашай арт-тусоўкі гэта пакуль незразумела.

Чаканыя творцамі ўхвальныя рулады арт-крытыкай не з'яўляюцца. У лепшым выпадку яны здольныя скласці рэкламны артыкул для буклета. Але для аўтара, чые працы там рэпрэзентаваны, ён будзе бессэнсоўным. А вось з разгромнага водгуку можна вынесці нешта карыснае. Бо ў гэтым выпадку ёсць надзея, што той, каго крытыкуюць, убачыць не толькі пералік недахопаў, але і магчымасці іх пераадолення. Ці зірне на сваю творчасць шырэй, з пункту гледжання іншага. І яго наступны праект будзе сапраўды арыгінальным, аўтарскім, новым, магчыма, не толькі для беларускага мастацтва. Такім чынам, сапраўдная крытыка прадуктыўная. Яна рухае мастацтва наперад. І ў гэтым яе галоўная функцыя.

Репозиторий БНТУ